№ 5 (310)
Люты 2010 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

Археалагічны помнік: *гарадзішча Лапічы* – стар. 3

Мой радавод: *сшытак з «працаднямі» як знаходка для архіва* – стар. 5

Рамяство: *керамісты з Дзяржынска* – стар. 7

Калегія Міністэрства культуры

27 студзеня адбылося пашыранае пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з парадкам дня «Аб працы па выкананні галіновай праграмы "Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь у 2006–2010 гг." і задачах арганізацый культуры на 2010 год». Пасяджэнне праходзіла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. З дакладам выступіў міністр культуры Павел Латушка. У абмеркаванні пытання выказаліся кіраўнікі ўстановаў і органаў культуры рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання, запрошаныя на калегію.

Выніковым дакументам вызначаныя накірункі дзейнасці галіны на 2010 год.

Уласная інфармацыя

Круглы стол у Мёрах

30 студзеня ГА «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» распачало новы сезон рэгіянальных мерапрыемстваў 2010 года. На гэты раз старшыня Рэспубліканскага савета БДТАПГК Антон Астаповіч ды сябры таварыства Зміцер Яцкевіч і Ігар Лялькоў наведалі Мёры, каб распачаць гэтыя мерапрыемствы ў межах акцыі «Будзьма беларусамі».

У гэтым паўночна-заходнім раённым цэнтры Беларусі мерапрыемства прайшло ў сярэдняй школе № 3 пры падтрымцы Мёрскага райвыканкама і пры ўдзеле прадстаўнікоў раённай выканаўчай улады . А непасрэдным арганізатарам круглага стала, пад час якога былі плённа абмеркаваныя пытанні краязнаўчага вывучэння Мёраў і ваколіцаў і інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай спадчыны ва ўстойлівым развіцці рэгіёну, стаў настаўнік гісторыі гэтай школы, вядомы рэгіянальны краязнаўца і энтузіяст-даследчык Вітаўт Ермалёнак.

Найбольшую цікавасць да праблематыкі круглага стала выказалі старшыня Дзісенскага гарвыканкама Вольга Мароз і старшыня Перабродскага сельскага Савета Галіна Паўловіч. Першая так прадставіла свой горад, што наступнага дня мінскія ўдзельнікі мерапрыемства выехалі ў старажытную Дзісну для знаёмства з яе старадаўняй і найбагацейшай гісторыяй і культурай. А на 6 лютага запланаваная паездка сяброў таварыства ў Дзісну, каб пазнаёміцца з мясцовымі краязнаўцамі.

Наш кар.

Падпісацца на «Краязнаўчую газету» можна з любога месяца. Будзьма разам!

Мястэчка Ула на паштоўцы пачатку мінулага стагоддзя

Фота з www.radzima.org

Акадэмік жывапісу з Улы

Да 200-годдзя І. Хруцкага

На працягу 2010–2011 гадоў у Беларусі плануецца шырока адзначыць 200-годдзе з дня нараджэння сусветна вядомага мастака, першага акадэміка жывапісу краіны, ураджэнца Улы Івана Фаміча Хруцкага. Такое рашэнне прынятае Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама створаны рэспубліканскі арганізацыйны камітэт на чале з міністрам культуры Рэспублікі Беларусь П.П. Латушкам. У яго склад з 13 чалавек увайшла і начальнік аддзела культуры Бешанковіцкага райвыканкама Н.М. Апанасёнак.

Якія ж мерапрыемствы запланаваныя ў рамках святкавання юбілею знакамітага майстра партрэта і нацюрморта?

Запланава шэраг мерапрыемстваў: выстаўка твораў мастака ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (з выданнем каталога); выстаўка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, прысвечаная жыццю і творчасці І.Ф. Хруцкага; выпуск памятнай манеты; выпуск паштовага блока, канверта «Першы дзень» і памятнае гашэнне. Адбудуцца рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя; міжнародны пленэр па выяўленчым мастацтве; рэспубліканскі мастацкі конкурс сярод навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў культуры і мастацтва Беларусі. На Віцебшчыне запланаванае правядзенне ўрачыстага сходу ў абласной філармоніі, устаноўка памятнага знака на месцы сядзібнага дома Івана Фаміча ў вёсцы Захарнічы Полацкага раёна і рамонт надмагільнага помніка мастаку на лясных могілках; адкрыццё выстаўкі працаў мастакоў – удзельнікаў шматлікіх пленэраў, прысвечаных І.Ф. Хруцкаму; увекавечванне памяці земляка ў назвах вуліцаў населеных пунктаў, звязаных з яго жыццём і дзейнасцю.

Важныя мерапрыемствы намечаныя і ў нас на Прыдзвінні. Галоўныя з іх – устаноўка бюста І.Ф. Хруцкага ў пасёлку Ула і стварэнне ў раённым гісторыка-краязнаўчым музеі экспазіцыі, прысвечанай жыццю і творчай дзейнасці выдатнага ўраджэнца Бешанковіцкага краю. Шмат мерапрыемстваў з нагоды 200-годдзя земляка запланавана і па лініі аддзела культуры райвыканкама. У прыватнасці, абмяркоўваецца пытанне стварэння ва Уле мастацкай школы імя І.Ф. Хруцкага.

Аб працы Бешанковіцкага краязнаўчага музея па ўшанаванні памяці знакамітага земляка мы будзем знаёміць на старонках «КГ».

Памятная манета, выпушчаная Нацбанкам Беларусі

Анатоль КРАЧКОЎСКІ,
гісторык, краязнаўца

Паяднаны з Пінскам

10 красавіка 2009 года памёр выдатны савецкі акцёр тэатра і кіно, тэатральны рэжысёр, сцэнарыст Яўген Якаўлевіч Веснік. Народны артыст СССР, ён стварыў шэраг запамінальных вобразаў у кінематографе, тэатры, на тэлебачанні. Каго ён толькі не іграў! Камісара паліцыі, фінансіста, пісьменніка, вучонага-біёлага, фельчара, афіцэра, прафесара, правазнаўца... Усяго Яўген Якаўлевіч зняўся амаль у 100 фільмах! Напісаў некалькі кніг, расказаў пра свой лёс у кіно і тэатры.

А ў Весніка, між тым, унікальная жыццёвая біяграфія. Нарадзіўся ў 1923 годзе ў Пецярбургу. Прымаў удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Малодшы лейтэнант, камандзір узвода 1-й гвардзейскай артылерыйскай брыгады. Быў узнагароджаны двума медалямі «За адвагу», ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені.

І яшчэ ў Яўгена Якаўлевіча – асаблівая роднаснасць з Берасцейшчынай. У горадзе над Пінай нарадзіўся бацька акцёра Якаў Ільіч Веснік.

І было гэта ў 1894 годзе. Бацька Якава – купец, адзін з багацейшых людзей дарэвалюцыйнага Пінска. Сваю пячатку на біяграфію Якава Весніка наклалі гады рэвалюцыйнага прадвесня. Яшчэ да пачатку Першай сусветнай сын купца паспеў паслужыць у войску і паступіў у Лазанскі універсітэт. Але вайна прывяла студэнта ў царскую армію. Ва Усходняй Прусіі Веснік быў цяжка паранены. Пасля шпіталя Якаў едзе ў Пецярбург.

У дні Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года наш зямляк узначальвае атрад салдатаў. А ў ліпені Якава прызначаюць камісарам пошты і тэлеграфа ў Выбаргскім раёне. З першых дзён стварэння Чырвонай Арміі Веснік уступае ў яе шэрагі. Удзельнічае ў баях на Паўднёвым фронце. Служба праходзіла ў складзе 11-й і 15-й армій.

Як удзельнік грамадзянскай вайны Якаў Веснік узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Драматычны эпізод з камісарам Веснікам здарыўся ў лютым 1921 года на Тыфліскім фронце. У баях за авалоданне чыгуначным мостам Якаў быў цяжка паранены, аказаўся на мяжы жыцця і смерці. Камісара размясцілі ў Бакінскім шпіталі. За цяжкапараненым наглядала маладая медсястра, чэшка па нацыянальнасці Яўгенія Немечак. Калі камісару пагражала ампутацыя абедзвюх ног, медсястра дала клятву: «Незалежна ад зыходу аперацыі, калі толькі застанецца жыць, выйду за яго замуж». Выжыў. Застаўся, на шчасце, з нагамі. І медсястра стала жонкай.

Закончылася грамадзянская вайна. Учарашні вайсковец становіцца адным з вядучых кіраўнікоў мірнага будаўніцтва маладой Савецкай дзяржавы. Узнаўляе захопленыя Рыдараўскія шахты. Наладжвае гандаль СССР з Амерыкай, Швецыяй. Працуе галоўным інжынерам на будаўніцтве нафтаправода ў Баку. Пасля ўзначальвае адзін з буйнейшых пракатных цэхаў «Магнітбуда».

А ў 1931 годзе Якаў Веснік прыязджае ў Крывы Рог. Займаецца будаўніцтвам «Крыварожсталі» і становіцца першым дырэктарам прадпрыемства. За высокія працоўныя дасягненні Якава Ільіча ўзнагародзілі ордэнам Леніна. А ў ліпені 1937 года арыштавалі. І, як многіх паплечнікаў наркама Г. Арджанікідзэ, расстралялі. Здарылася гэта 17 лістапада, праз некалькі дзён пасля 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Жонку Яўгенію адправілі ў высылку ў Казахстан. 14-гадовы сын Яўген Веснік аказаўся ў дзіцячым доме.

У Крывым Рогу ёсць вуліца імя Весніка. А сын героя грамадзянскай вайны і арганізатара савецкай прамысловасці ў Крыварожскім тэатры імя Т. Шаўчэнкі паставіў у гонар свайго бацькі спектакль «Чыстка». Мо з часам памяць пра Якава Весніка будзе ўшанаваная і ў Пінску?..

Кастусь ЛЕШНІЦА

Помнік болю і памяці

Кожнае лета я прыязджаю ў Зацітаву Слабаду да бабулі. Тут жывуць мае сябры. Тут, на вясковым улонні, люблю я бавіць час. Наша родная вёска, а іначай і не магу назваць Зацітаву Слабаду, мае ажно дзве ракі. Меншую – Цітаўку, што шнурочкам уецца аднекуль з-за Мар'інай Горкі, і Свіслач, якая шмат большая і даўжэйшая. Бо ведаю і Свіслач мінскую, сталічную, закутую ў бетонныя берагі. Ёсць навокал лясы, балаціны, ёсць нават чысцюткія крыніцы, вада з якіх надзіва смачная. А ў цэнтры вёскі ў невялікім скверы – помнік. Як і калі ён з'явіўся, мне расказала бабуля. Ставілі гэты помнік, як ёй падаецца, зусім нядаўна, а калі бабуля пачала падлічваць гады, то аказалася, што было гэта каля чатырох дзесяцігоддзяў таму.

І помнік – сціплая бетонная стэла з выявай сумнай жанчыны – пастаўлены ў гонар землякоў, якія не вярнуліся з Вялікай Айчыннай...

Падыходжу да помніка, на якім выпісаныя знаёмыя вясковыя прозвішчы: К.С. Шышко, В.Л. Шчэрба, І.К. Трус, П.І.Дзятко, Н.М. Скарабагаты... Чытаю надпіс: «Дарагія родныя! Мы вас помнім, ад нас, жывых, паклон вам... 1941–1945»... Ад бабулі ведаю, што амаль усе, чые прозвішчы ёсць на помніку, пайшлі на фронт ці ў партызаны ў маладым узросце. Некаторыя загінулі, не зведаўшы кахання, не маючы дзяцей. А хтосьці пакінуў сіратамі аднаго, двух ці нават трох сыноў і дачок... Самае страшнае, што можа ўявіць чалавечая свядомасць, – вайна. І мне хочацца, каб гэты сціплы помнік у Зацітавай Слабадзе быў вечным. І ў год, калі ўся Беларусь разам з іншымі краінамі будзе адзначаць юбілей Вялікай Перамогі, і ва ўсе наступныя гады-дзесяцігоддзі... А мае равеснікі, і дарослыя, і дзеці ўсіх наступных пакаленняў каб помнілі пра боль і вялікую трагедыю, якія напаткалі наш народ, нашых дзядоў-прадзедаў з Зацітавай Слабады, Пухавіцкага краю, усёй Беларусі.

Дар'я ШОЦІК,
вучаніца 11 класа СШ № 62
г. Мінска

Іркуцкія Грамніцы

2 лютага ў Сядзібе Сукачова ў Іркуцку тамтэйшы Моладзевы клуб «Крывічы» правёў старажытны беларускі абрад «Грамніцы».

Штогод у лютым беларусы адзначаюць «Грамніцы», інакш – «Стрэчанне», і кажуць, што ў гэты дзень зіма з летам сустракаецца – адсюль і другая назва. Беларусы з гэтым днём звязвалі мноства прыкметаў: «Калі на Стрэчанне певень пад страхой нап'ецца, то на Юр'я вол травы наесца»; «Калі адліга на Грамніцы – вясна будзе цёплая, калі марозы завярнуць, то халодная»; «Калі пеж на Стрэчанне – добры будзе ўраджай пшаніцы» ды іншыя.

У гэты дзень беларусы Іркуцка распальвалі рытуальнае вогнішча старадаўнім спосабам – без запалак і запальніцы, вадзілі карагоды і спявалі абрадавыя песні, а таксама гулялі ў зімовыя старажытныя гульні і танчылі побытавыя народныя танцы.

А яшчэ кожны ўдзельнік з сабою прынёс свечку, якую можна было тут жа асвяціць. Пра яе магічныя ўласцівасці прысутныя даведаліся пад час вечарыны-святкавання.

Алег РУДАКОЎ,
г. Іркуцк (Расія)

Колішні касцёл ва Уздзе (цяпер – дом культуры) і брама перад ім

На тым тыдні...

25 студзеня ў Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага прайшла **сустрэча** вучняў школы № 20 **з вядомым краязнаўцам, аўтарам кнігі па гісторыі Брэстчыны «Святая для сэрца» Анатолем Бензяруком.** Прысутныя змаглі лепей пазнаёміцца з сучаснай беларускай дзіцячай кнігай, былі прадстаўленыя кніжныя навінкі сталічных выдавецтваў для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту.

У дзень нараджэння знакамітага акцёра, паэта і музыкі Уладзіміра Высоцкага 25 студзеня ў сталічным клубе «Лисья нора» творчае аб'яднанне «Своя среда» правяло канцэрт-сустрэчу для прыхільнікаў творчасці артыста, лёс якога неаднаразова перакрыжоўваўся з Беларуссю. Акрамя барда з Ніжняга Тагіла (Расія) Яўгена Чулкова ўдзел бралі мінскія барды. Быў таксама прапанаваны фільм, змантаваны з кадраў кінаархіва Высоцкага.

У Мінску ў галерэі Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі па дабраславенні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі і біскупа Рашка-Прызранскага і Косава-Метахійскага Арцемія **26 студзеня** адкрылася **дабрачынная фотавыстаўка «Душа Сербіі»**, прымеркаваная да нацыянальнага свята гэтай краіны – Дню святога Савы. Прадстаўленыя 45 твораў фотамастака Дарка Дозета – погляд на жыццё косаўскіх сербаў. Прайшоў паказ дакументальнага фільма «Косава. Стрэчанне». Выстаўка працуе ў Мінску да 1 сакавіка, а потым будзе дэманстравацца ў іншых абласных цэнтрах нашай краіны.

У сталічнай галерэі «Ракурс» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **28 студзеня** адкрылася **кніжна-ілюстрацыйная выстаўка «Вялікі талент, вялікая работа, вялікае сэрца»** лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэміяў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2009 года. Ва ўрачыстым мерапрыемстве бралі ўдзел архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх, выканаўчы дырэктар выдавецтва Беларускага Экзархата Уладзімір Грозаў, дырэктар музея народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» Марыя Астаповіч, дырэктар ЦБС Полацка Тацяна Савельева, выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Мікалай Сеўрукоў ды іншыя лаўрэаты. У рамках акцыі прайшла літаратурна-творчая сустрэча. Дэманстраваліся фрагменты дакументальнага серыяла «Зямля беларуская», працы навучэнцаў Горацкай дзіцячай школы мастацкіх рамёстваў, выступілі фальклорны калектыў Цэнтра культуры і народнай творчасці в. Вулька-1 Лунінецкага раёна і навучэнцы акадэміі музыкі.

Гарадзішча Лапічы

Аўтар гэтых радкоў ужо звяртаў увагу чытачоў на гісторыю мястэчка Лапічы Асіповіцкага раёна (гл. «Краязнаўчую газету» №№ 19–21 за 2008 г.). У тым артыкуле згадвалася, што каля сучаснага паселішча захаваўся помнік жалезнага веку – гарадзішча Лапічы.

Апісанне гэтага помніка можна сустрэць у розных выданнях гісторыка-археалагічнай тэматыкі пад назвамі «Гарадзішча Лапічы», «Гарадзішча Зарэчча» або «Троіцкая Слабада». Справа ў тым, што сучасныя Лапічы – гэта вялікае паселішча, якое цягнецца ўздоўж берага Асіповіцкага вадасховішча на некалькі кіламетраў. Як і ў іншых падобных выпадках, гэты населены пункт склаўся з некалькіх розных па памерах больш-менш самастойных паселішчаў з рознымі назвамі. Таму навукоўцы, якія ў розныя гады даследавалі гарадзішча, давалі яму назву па бліжэйшай, па іхніх развагах, вёсцы.

Найбольш поўныя звесткі пра гэты археалагічны помнік надрукаваныя ў кнізе Л.Д. Побаля «Славянские древности Белоруссии» выдання 1974 года. Пазнейшыя па часе выданні, як правіла, паўтараюць інфармацыю з гэтай кнігі.

Мэтай некалькіх нашых экскурсіяў у Лапічы было параўнаць звесткі з навуковай і навукова-папулярнай літаратуры з тым помнікам, што знаходзіцца ў Лапічах на самой справе.

Такім чынам, мы ўбачылі на ўласныя вочы, што бераг вадасховішча ў межах Лапічаў у значнай меры даволі высокі, і яго без развагаў можна лічыць берагам той Свіслачы, якая цякла тут да пабудовы ГЭС. У натуральных паніжэннях рэльефу больш-менш захаваліся малыя прытокі Свіслачы. Усяго іх чатыры. Калі ісці зверху ўніз, то гэта Цалянка, Няцеча, Дражанка, Граўка. Назвы Цалянкі і Граўкі шырока вядомыя і сустракаюцца ў літаратуры XIX стагоддзя, Няцечу ведаюць некаторыя старыя жыхары, а Дражанка зараз – безназоўны ручай, яго назва згадваецца толькі ў старажытных дакументах.

За некалькі кіламетраў ад Лапічаў на поўнач і на паўночны ўсход захаваліся рэшткі багністых пустак, калісьці – тыпавых верхавых балотаў, якія і з'яўляліся вытокамі раней пералічаных рэчак і ручаёў. Вышэй мястэчка, калі мы пойдзем па беразе ракі ў напрамку вёскі Вялікі Бор, то таксама не абмінем балота, бо левы бераг тут значна паніжаецца.

Мы бачым, што мясціны ў наваколлі Лапічаў вельмі спрыяюць рассяленню людзей: высокія пагоркі тут перамяжаюцца з багністымі рэчышчамі ручаёў, дзе заўсёды можна знайсці ўчасткі з урадлівай глебай. Балоты ў акрузе з'яўляюцца натуральнымі перашкодамі для магчымых ворагаў, а

Рэшткі вала

рака Свіслач – гэта добры шлях зносінаў і крыніца для здабыцця харчавання.

Такую выснову можна пацвердзіць рэчамі і прыладамі працы каменнага, бронзавага, жалезнага вякоў, а таксама сярэднявечча, якія былі знойдзеныя тут у розныя часы.

Лапічы неаднаразова даследаваліся археолагамі, але ж нельга казаць, што яны добра вывучаныя. Акрамя двух гарадзішчаў і курганоў, якія апісаныя ў літаратуры, тут можна знайсці і сляды неўмацаваных паселішчаў розных эпохаў.

А пакуль што ўважліва разгледзім адзін помнік – гарадзішча. Яно знаходзіцца ў гістарычным цэнтры Лапічаў, у трыкутніку паміж левым берагам Дражанкі і берагам вадасховішча.

Вёска (сяло) Лапічы, якой, мяркуючы па пісьмовых крыніцах, не менш за 450 гадоў, ляжыць на процілеглым беразе таго ж ручая. Тут жа была і царква, якая за стагоддзі свайго існавання перажыла і пераходы з адной веры ў другую, і разбурэнні, і аднаўленні, і перайменаванні. Трохі вышэй па-над гэтай жа Дражанкай мясціўся і двор уласнікаў вёскі.

Паўвыспа, на якой знаходзіцца гарадзішча, у эпоху феадалізму не забудоўвалася і мела назву «Гарышча». Паводле гістарычных дакументаў тут была панская сенажаць. Само гарадзішча знаходзіцца на мысе гэтай паўвыспы, яго зараз займаюць могілкі.

Паводле Л.Д. Побаля помнік у плане амаль круглы, з усіх бакоў акапаны ровам і абнесены валам. На самой справе вал, як і ў іншых мысавых умацаваннях, знаходзіцца толькі з боку поля. Пляцоўка помніка авальная, выцягнутая ўздоўж восі паўночны захад – паўднёвы ўсход.

У адным месцы з боку вёскі вал перарываецца, але гэта не ўваход на пляцоўку, як можна палічыць, гледзячы на малюнак з кнігі Л.Д. Побаля, а хутчэй за ўсё звычайны яр, які існаваў і ў старажытнасці. Верагоднасць таго, што праз яр быў арганізаваны ўваход, існуе, але ж такі ўваход вельмі нязручны.

Вышыня вала з боку поля прыкладна два метры. У навейшы час вал перарэзаны двума праходамі. Гледзячы на іх сценкі, бачна, што валы насыпаліся проста з пяску.

Перад валам можна ўбачыць роў, глыбіня якога зараз каля паўметра. З боку Свіслачы гарадзішча падпіраюць два яры, роў губляецца ў адным з іх.

На пляцоўцы гарадзішча, а таксама каля яго, шчыльна месцяцца сучасныя могілкі. Пясок з вала патроху выбіраецца на падсыпку могілак. Культурнага слою, калі лічыць па нядаўна раскапаных участках, амаль няма. Гэта дае магчымасць думаць, што перад намі гарадзішча-сховішча. Сама пляцоўка няроўная, яе бліжэйшая да Свіслачы частка мае бачны ўхіл да вады. Ад краю пляцоўкі да сённяшняга ўзроўню Асіповіцкага вадасховішча 3–3,5 метра вышыні.

З-за могілак, дрэваў і вялікіх памераў пляцоўкі даўжыню і шырыню помніка вымераць вельмі складана. Аднак у нас была мэта намаляваць план помніка, і адзіны сродак для гэтага, які мы знайшлі, – выкарыстоўванне вуглавых каардынатаў (у сярэдзіне пляцоўкі быў нейкі свабодны ад могілак «пятачок», з якога быў бачны вал амаль на ўсёй ягонай даўжыні).

Усе вымярэнні праводзіліся ў снежні, калі на зямлю лёг снег, што разам з адсутнасцю зеляніны паспрыяла нашай працы. Работа праводзілася аўтарам гэтага артыкула і дзвюма навучэнкамі з Лапіцкай школы. Скарыстаныя інструменты – афіцэрскі компас і звычайная рулетка на 10 м.

Ад цэнтра пляцоўкі да вала пракладзеныя алейкі.



План гарадзішча Лапічы

Яны няроўныя і ніяк не супадаюць з напрамкамі па баках свету. Але ж гэтыя алейкі далі нам магчымасць вымераць адлегласць ад цэнтра да вала па трох промнях. Чацвёртым промнем быў напрамак да ракі. Занатаваныя былі таксама вымярэнні вуглоў паміж промнямі.

Потым мае памочніцы адыходзілі ад кожнай з трох кропак, дзе нашыя промні сустракаліся з валам, у адзін і ў другі бок па версе вала так, каб я, стоячы ў цэнтры, мог іх бачыць. Так мы атрымалі вуглавыя каардынаты яшчэ шасці кропак.

Працягваючы працу такім чынам, мы знайшлі каардынаты нейкай сістэмы кропак. Усе вымярэнні сапраўдных памераў помніка праводзіліся ўжо дома з дапамогай міліметровай паперы.

Вынік усёй працы – план гарадзішча Лапічы, які я выношу на суд чытача. На мой погляд, ён вельмі падобны да рэальнасці.

Юрый КЛЕВАНЕЦ,
г. Асіповічы

У тэатры «Зніч»

Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра «Зніч» **15 лютага** а 15 гадзіне запрашае на монаспектакль **«Мой Маленькі прынц»**, створаны паводле знакамітай казачнай аповесці Антуана дэ Сэнт-Экзюперы і вершаў Беранжэ ў цудоўным перакладзе Ніны Мацяш. Артыстка Раіса Астрадзінава прапануе яшчэ раз перагарнуць філасофскую казку пра пошукі, пра сяброўства, пра навуку адказнасці за іншых. У спектаклі гучыць музыка Яўгена Глебава з балета «Маленькі прынц» і Радзівона Глебава.

Увечары **таго ж дня** – **«Не праклінай, што я люблю»**. Монаспектакль створаны паводле вершаванага рамана Ніла Гілевіча «Родныя дзеці». Старонкі твора глядач перагорне разам з акцёрам Міколам Лявончыкам і пад цымбальнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай.

16 лютага Вячаслаў Шакаліда запросіць маленькіх гледачоў на лялечны монаспектакль **«Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага»**, створанага паводле аднайменнай казкі Пятра Васючэнкі і Сяргея Кавалёва. Гэтая гісторыя пра тое, як два паны пайшлі ў свет белы лепшай долі шукаць. Пачатак – а 14-й гадзіне.

На **22 лютага** запланаваныя два спектаклі. А 15-й гадзіне дзяцей запросяць на монаспектакль-сустрэчу паводле твораў Віталя Вольскага **«Вясёлая карусель»**. Выканаўца – заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ларыса Горцава, музычнае суправаджэнне – цымбалісткі Дар'і Неўмяржыцкай.

Увечары – паэтычны монаспектакль **«Прыпадаю да нябёс...»**, у аснову якога пакладзеныя вершы выдатнай паэткі Яўгеніі Янішчыц. Выканаўца – заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ларыса Горцава.

«Мой Маленькі прынц»

Вечаровыя пастаноўкі пачынаюцца а 19-й гадзіне. Спектаклі адбываюцца ў тэатральнай зале культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены ў Мінску. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефоне ў Мінску (017) 331-75-53.

Знайсці там, дзе знаходзілі да цябе

Краязнаўчая вандроўка ў Лявонпаль

Вёска Лявонпаль (былое мястэчка) не аднойчы станавілася аб'ектам вывучэння гісторыка-археалагічнага гуртка «Арганаўты мінулага», які працуе ў мёрскай СШ № 3. Найбольш грунтоўная вандроўка была ў 2000 годзе, якая папярэднічала святу 1000-годдзя паселішча. Менавіта тады было зроблена важнае археалагічнае адкрыццё курганнай групы X–XIII стагоддзяў. Кожны год гурткоўцы праводзілі аднадзённыя выезды ў Лявонпаль.

Летась у вандроўцы прыняла ўдзел малодшая група «арганаўтаў» – вучні 6 і 7 класаў. Спачатку мы падрабязна азнаёміліся з асноўнымі архітэктурнымі помнікамі вёскі, дайшлі да калоны ў гонар першай у Еўропе Канстытуцыі 1791 года, якая знаходзіцца за паўкіламетра ад вёскі. Вучні пачулі цікавае мясцовае паданне аб пакаёўцы Марысі і кавалі Васілю, які быццам бы на загад пані Лапацінскай быў замураваны ў слупе. Пабылі вучні ў Музеі Радзімазнаўства, створаным нашым земляком паэтам Сяргеем Панізьнікам, пазнаёміліся з гісторыяй былой польскай школы, пабудаванай мясцовымі майстрамі напрыканцы 1930-х гадоў, будынак якой вытрымаў цяжкія выпрабаванні пад час вайны, але цяпер паступова прыходзіць у заняпад. Краязнаўцы даведаліся таксама пра гісторыю царквы Святой Троіцы, пабудаванай з дрэва ў 1773–1775 гадах на сродкі Мікалая Лапацінскага, і званіцы таго часу. У царкве захаваліся распяцце пачатку XIX стагоддзя, абразы і звон, адліты ў Рызе ў 1761 годзе. Уразіў удзельнікаў вандроўкі і велічны палац Лапацінскіх, пабудаваны ў 1767 годзе з цэглы. З цікавасцю слухалі гурткоўцы аб багаццях, якія калісьці тут захоўваліся: калекцыі карцінаў, старадаўнія кнігі, архівы, аранжарэі, мануфактуры і г.д. Захапіла вучняў і гісторыя роду Лапацінскіх. Але краязнаўцам не цярпелася як хутчэй самім уключыцца ў пошукі мінулага. Паставіўшы намёты і паабедаўшы, «арганаўты» (маючы дазвол на раскопкі) пачалі працу на мясцовасці.

Былая школа

Фота Алеся АНІСЬКОВІЧА

Гурткоўцы загадзя былі папярэджаныя: знайсці што-небудзь цікавае – вельмі цяжкая справа. Пасля столькіх вандровак папярэднікаў, пасля «пошукаў» «чорных археолагаў» з металашукальнікамі складана будзе зрабіць новыя адкрыцці. Таму ад кожнага патрабуюцца пільнасць і ўвага. Галоўнае, не прапусціць кожнай дробязі, перацірацъ у пальцах кожны камячок зямлі. Пасля кароткага інструктажу пачалася шчырая праца. І плён яе стаў бачны адразу. Ужо на самым высокім беразе Дзвіны былі знойдзеныя гільзы і кулі, шрапнель ад снарадаў часоў грамадзянскай вайны. Менавіта па гэтым беразе праходзілі пазіцыі польскіх войскаў, на ўзбраенні якіх былі англійскія, французскія, нямецкія вінтоўкі і карабіны, таму мы знайшлі гільзы Рэмінгтона, Лябеля, Сміт-Весана і іншыя. Аб баявых дзеяннях Чырвонай Арміі ў 1919–1920 гадах кажуць гільзы ад вінтовак Мосіна, кулямёта «Максім». Былі знаходкі і часоў Другой сусветнай вайны, што засведчыла як аб баявых дзеяннях партызанаў, так і Савецкай Арміі пад час вызвалення ў 1944 годзе. Але мы знайшлі і больш старыя кулі – часоў вайны 1812 года і крэмні для крэмневых пісталетаў. І не дзіўна. Тут адступала ў Дрысенскі лагер 2-я руская армія Барклая-дэ-Толі і войскі французскага генерала Удзіно. Нялёгка краязнаўцам было весці пошук: зарасці крапівы ды хмызняку перашкаджалі бачыць зямлю; але нішто не змагло перашкодзіць гурткоўцам. Акрамя вайсковых рэліквіяў знайшлі шмат аскепкаў керамікі XVI–XIX стагоддзяў, шкла і парцаляны, старадаўнія цвікі, жалезныя вырабы мясцовых кавалёў. Але асабліва цікавымі былі знаходкі кафлі XVIII–XIX стагоддзяў, мармуровай пліткі, што пры далейшых даследаваннях дазволіць аднавіць інтэр'еры камінаў сядзібы ў Лявонпалі. Былі знойдзеныя і шматлікія фрагменты рэчаў з бронзы і медзі (у тым ліку і ад астралябіі), якія былі ў палацы Лапацінскіх. Цікавая таксама знаходка бронзавага ключа XVIII стагоддзя.

Калона

Фота Алеся АНІСЬКОВІЧА

Асабліва шчыравалі ў пошуку Ігар Кандратовіч, Дзіма Захарэвіч, Ігар Дзярко, Ілля Варонька, Сяргей Вішнеўскі, Наташа Аляксеева, Арцём Калеснік... Але сапраўднай сенсацыяй стала знаходка ветэранам гуртка Антонам Ермалёнкам (на той час – студэнтам гістфака БДУ) бронзавай пячаткі XIX стагоддзя графаў Лапацінскіх з выявай іх герба «Любіч».

Гуртоўцы не толькі вялі пошук на мясцовасці, але і сустракаліся з старажыхарамі. Надзвычай цікавай была размова з званаром лявонпальскай царквы Фёдарам Іванавічам Пірагом (1934 года нараджэння). Ад яго «арганаўты» пачулі аб мінулым Лявонпаля, яго жыхарах. Ён захоўвае шмат старых фотаздымкаў. Асабліва цікавымі былі здымкі вучняў і настаўнікаў мясцовай школы 1928 і 1931 гадоў, сямейныя фота, самыя старыя з якіх – пачатку XX стагоддзя. Сапраўды унікальны для краязнаўцаў – здымак 1941 года першых старшыняў калгасаў перад будынкам Валькоўскага сельсавета (гэта кіламетры за тры ад Лявонпаля, зараз вёска не існуе). Шмат апавядаў Фёдар Іванавіч аб гісторыі Лявонпаля і наваколля пад час міжваеннай Польшчы, пра гісторыю млына на рацэ Волта, які быў кіламетры за два ад Лявонпаля, непадалёк ад былой вёскі Смулькі. Лёс млынара Пяткевіча, які карыстаўся павагай мясцовага насельніцтва, трагічны: у 1940 годзе расстраляны бальшавікамі ў Беразвецкай турме. У спісах рэпрэсаваных у кнізе «Памяць» па Мёрскім раёне яго прозвішча няма. Ірына, ягоная цяжарная жонка, цудам уратавалася. Цяпер іх сын Георгій працуе галоўным урачом Боркавіцкай бальніцы на Полаччыне, карыстаецца вялікай павагай насельніцтва. Гурткоўцы пачулі цікавы аповед аб вёсцы Скакуны і французскіх могілках каля яе. У падзяку за цікавыя ўспаміны «арганаўты» дапамаглі Фёдару Іванавічу скласці ў кучы сена.

Млын Пяткевіча

Фота Сяргея ПАНІЗЬНІКА

Краязнаўцы пабылі і на месцы яўрэйскіх могілак. На жаль, асноўныя пахаванні знішчаныя дарогай, якая прайшла праз могілкі. Побач мы адшукалі і каталіцкія могілкі, але большая частка іх разбураная той жа дарогай; ацалеў толькі адзін помнік Антону Пухальскаму (1841–1931) з вёскі Сардыкі.

Асаблівае месца ў пошуках было адведзенае вывучэнню баявых дзеянняў 270-й стралковай Дзямідаўскай Чырванасцяжнай дывізіі, 154-й стралковай дывізіі.



Распяцце

Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

Пад час вандроўкі краязнаўцы сабралі шмат і этнаграфічнага матэрыялу, дакументаў для гістарычнага музея. Асаблівая падзяка жыхарам Лявонпаля Ніне Паўлаўне Бычышнай і Аляксандру Віктаравічу Твараровічу, якія садзейнічалі паспяховаму пошуку. А яшчэ нашая вандроўка не была б такой плённай, калі б побыт лагера і гатаванне ежы не арганізавалі класныя кіраўнікі Наталля Леанідаўна Гагалінская і Вольга Уладзіміраўна Няміра.

Вітаўт ЕРМАЛЁНАК,
кіраўнік гісторыка-археалагічнага гуртка «Арганаўты мінулага», г. Мёры

Пячаткі Лапацінскіх

Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

Радаводныя замалёўкі

Мая першая спроба паступіць у ВНУ ў 1955 г. скончылася няўдала – недабраў, як тады казалі, балаў. ВНУ тая была – Маскоўскі гісторыка-архіўны інстытут – адзіная навучальная ўстанова, якая рыхтавала прафесіяналаў архіўнай справы для ўсяго былога СССР. Адзіная – таму і прэстыжная. А ў прэстыжную трапіць не проста, тым больш хлопчыку з беларускай перыферыі.

У мяне часта пытаюць, чаму так вабіў менавіта архіўны інстытут? І дакладнага адказу на гэтае пытанне я не знаходзіў, можа, нават яго і няма. Адказ у комплексе жыццёвых падзеяў і выпадкаў.

Выпадак першы з пасляваеннага дзяцінства

Мой дзед па маме – Пракоп Сцяпанавіч Галоцік павінен быў кожны дзень запісваць працадні сялянаў калгаса імя С.М. Будзёнага. Яны гэта называлі «ставіць палачкі». Памятаю, у самаробным сшытку з нямецкіх тапаграфічных картаў ён алоўкам маляваў клетачкі, упісваў у іх прозвішчы калгаснікаў і дні чарговага месяца. Маленькія клетачкі насупраць прозвішчаў штодня запаўняліся вертыкальнымі рысачкамі – «палачкамі», і гэта азначала, што той ці іншы калгаснік адпрацаваў адзін працоўны дзень – «працадзень». Трапляліся пустыя клетачкі, але іх было мала. Дзед Пракоп быў вельмі адказным чалавекам, таму кожны вечар, запаліўшы «газоўку», ён акуратна, па памяці, запаўняў клетачкі, а ў канцы месяца падводзіў вынік – колькі «працадзён» адпрацаваў кожны калгаснік.

Дзед любіў свайго першага ўнука і таму стараўся даць грунтоўныя адказы на ўсе яго дзіцячыя пытанні: для чаго гэта ён робіць, куды свае сшыткі ён аддае?

З першым пытаннем – для чаго – было ўсё зразумела. Патрэбны ўлік, каб ведаць, колькі калгас павінен пад канец года выдзеліць на працадзень бульбы, ячменю, буракоў (здаецца, больш нічога не давалі) на кожнага калгасніка пасля абавязковых дзяржнарыхтовак.

З другім пытаннем было складаней. Дзед свае сшыткі, запоўненыя «палачкамі», аддаваў старшыні калгаса. А калі я папытаў, каму іх аддае старшыня, дзед не задумваючыся адказаў – у сельсавет. Праўда, далей шлях такога важнага дакумента, як сшытак з «палачкамі», на якія ў той 1950 год давалі па 200 г ячменю і па 1 кг бульбы за адну, дзедам прасочваўся не вельмі ўпэўнена. Па яго словах, сшытак трапляў у Капыль, з Капыля ў Бабруйск (кароткі час абласны цэнтр), з Бабруйска ў Мінск, а ўжо з Мінска, мабыць, у Маскву да таварыша Сталіна. Не ведаю, можа, апошні адрасат – гэта дзедаў жарт, але мяне ён запэўніў, што нашае прозвішча вядомае таварышу Сталіну менавіта дзякуючы сшытку з «палачкамі». Можа, так яно і было?

А можа, захаваліся дзедавы сшыткі ў раённым архіве? Уявіце сабе, які б гэта быў унікальны дакумент для гісторыі, калі б захоўваўся ў архіве.

Фрагмент карты, на якой абазначаная вёска Острава

Выпадак другі – з юнацтва

У час вучобы ў 9-м класе мне давялося хадзіць у Навасёлкаўскую дзесяцігодку ў Капыльскім раёне. Гісторыкам у школе быў нейкі дзівак па мянушцы «Вача». Так звалі Васіля Міхайлавіча Чэркаса і настаўнікі, і вучні. Дзіваком ён быў сапраўдным – і па адзенні, якое насіў, ніколі не мяняючы свайго старога пінжака і штаноў, і па выкладанні свайго прадмета – гісторыі. Апошнюю ён па падручніку ніколі не выкладаў, прымушаў завучваць даты гістарычных падзей ды з жыцця гістарычных асобаў. Адзнаку ў класны журнал Вача ставіў выключна за веданне ўсіх гістарычных датаў. Выкладаў толькі па нейкіх пажоўклых паперах і тое, што ні ў адным падручніку прачытаць было немагчыма. Таму ад яго мы ўпершыню пачулі назвы летапісаў, спасылкі на архіўныя дакументы. Гэта была сапраўдная гісторыя, якую я адкрыў для сябе дзякуючы дзіваку Вачу, ягоным аповедам пра архівы і тыя дакументы, што там «хаваюцца».

Пра што сведчаць архівы...

На нашай зямлі многа Гілёў, Гілевічаў, Гількоў і нават Гулякаў, а вось Гілепаў мала. Канечне, мы, Гілепы, ужо разышліся па ўсім свеце. Жывуць і ў Расіі, Амерыцы, Славакіі, ва Украіне, а больш за ўсё (пасля Беларусі) чамусьці ў Эстоніі. Некалі мама, Марыя Пракопаўна, перажыўшы 90 гадоў, расказвала, што былі нават два Гілепы, якія з'ехалі на заробкі ў Амерыку (усе заакіянскія дзяржавы ў маёй вёсцы называліся адным словам – Амерыка). Дык аднаго з іх амерыканцы «вытурылі за камунізм» (як казала мама), а другі вярнуўся з-за хваробы – «паміраць дадому». Адзін і другі мала расказвалі пра сваю вандроўку, але заўсёды заканчвалі адным:

Уладзімір з дзедам Пракопам і дзядзькам Мікалаем (1945 г.)

«Лепшае месца на свеце – наш Остраў, у Амерыцы нічога падобнага няма».

Вёска нашая – Острава. Назва мянялася на Востраа, Острово, Остраў (былі і іншыя варыянты). Усё залежала ад таго, хто гаспадарыў на нашай зямлі: ён і называў вёску на свой капыл. А тут пабывалі і шведы, французы і немцы, палякі і рускія. На вастрыі сваіх штыкоў яны смела маглі прынесці і маё прозвішча, пакінуць у Востраве, дзе гістарычна і пачынаецца мой беларускі радавод па бацькавай лініі. Вельмі хочацца сказаць «па мячы», ды архіўныя крыніцы не дазваляюць. Ад вядомага з другой паловы XVIII стагоддзя майго пра-пра-пра... дзеда Ігната – род гэты сялянскі. Пра гэта сведчаць дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

Вось таму і палез я ў глыбіні стагоддзяў, каб урэшце высветліць, адкуль я, адкуль пайшоў мой род, дзе яго карані.

Захапляльная гэтая справа – пошук. Асабліва калі ўдаецца бесперапынна прасачыць некалькі пакаленняў продкаў. Колькі новых імёнаў адкрылася, і, магчыма, яны будуць паўтораныя маімі нашчадкамі. Нязменным застаецца з XVIII стагоддзя толькі прозвішча, якое перапісчыкамі заўсёды пісалася без памылак з тых самых пяці літар, як і сёння: Гілеп.

Аднак, пакуль я так і не даведаўся, як у маёй роднай вёсцы, дзе землякі носяць прозвішчы жывёльнага і расліннага паходжання (Сокалы, Каршуны, Пешкуры, Буракі, Качаны, Чэрнікі), з'явіліся Гілепы. Ці то швед-небарака заблукаў на востраў сярод беларускіх балотаў, ці то (яшчэ раней) рэфарматарскія хвалі прыбілі да вострава славяніна-чэха. Адным словам – Востраў ён і ёсць Ostrov: так напісана на карце 1859 года, якая вісіць над рабочым сталом рэдактара «Краязнаўчай газеты». А гэта азначае, што пошук мой будзе працягнуты, а чытача «КГ» чакаюць новыя старонкі з біяграфіі аднаго з прадстаўнікоў старажытнага сялянскага роду з неразгаданым яшчэ прозвішчам.

Уладзімір ГІЛЕП

Каля роднай хаты з суседзямі (в. Острава, Капыльскі раён, 2005 г.)

Праспявала сваё шчасце...

Так заўсёды гаварыла мама лунінчанкі Іраіды Аляксандраўны Канапліцкай. Працавала ў полі ці ішла па лясной дарозе – усё рабіла з песняй на вуснах. Але ўсмешка пакінула твар жанчыны, калі ёй было крыху за 30, – лёс наканаваў сям'і шмат жыццёвых выпрабаванняў.

Дзядуля – чыгуначнік з-пад Баранавічаў, у пачатку 1920-х гадоў прыдбаў зямельны ўчастак у 20 гектараў на хутары Любажэрдзе. На схіле гадоў планаваў займацца сельскай гаспадаркай з дапамогай шасцярых дзяцей. Разбіў сад, заклаў пчальнік. Але не прынесла спакою новае месца жыхарства. Недаравальна маладой – толькі 50 споўнілася – пайшла з жыцця жонка, потым адна за адной – дзве дачкі. Здавалася, нарэшце беды скончыліся. Старэйшую дачку выдаў замуж за селяніна ў Лунінец. У гэты ж час сына забралі ў Войска Польскае. Але пад адным дахам з бацькам заставаліся яшчэ трое памочнікаў – дачка з яе мужам, таксама хутаранінам, і малодшы сын.

Іх і вывезлі лютаўскай непагаддзю 1940 года на вазах, даўшы на зборы дзве гадзіны. Даведаўшыся пра гэта, Вольга Пятроўна Гнедзька схапіла лусты хлеба, што былі ў хаце, прыбегла на станцыю, здолела прабіцца праз ачапленне і развітацца з роднымі, якіх пагрузілі ў таварныя вагоны на шлях у невядомасць. Потым паспяшалася да бацькоўскай сядзібы, але яе ўжо аблюбавалі тыя, хто падпісаў ліст з прозвішчамі кулакоў, – адчувалі сябе гаспадарамі, седзячы за сталом і наварочваючы хлеб, шчодра паліты мёдам.

– Суседзі, як жа вам не сорамна?! Гэта ж не ваша, – усклікнула жанчына.

– Была ваша – стала наша! – зарагаталі людзі, якія яшчэ нядаўна збіраліся на гасцінны двор Каменкаў, калі тыя на святы ўсёй сям'ёй спявалі шчымлівыя народныя песні, прыцягваючы навакольных.

Ад несправядлівасці слёзы засцілі вочы. Толькі і сарвала са сценкі ўласнаручна выраблену макатку – чырвоныя рабіны на чорным фоне...

– Пры акупацыі маму выклікалі ў арбайцант, – расказвае Іраіда Аляксандраўна. – Абяцалі, што вернуць дом і зямлю, калі назаве імёны тых, з-за каго рэпрэсавалі родных. Яна сказала, што не ведае. У



сапраўднасці былі вядомыя і гэтыя людзі, і тое, што дом перавезлі ў горад. Чужое дабро не прынесла ім шчасця. Непрыгожа завяршылася жыццё і іх, і іх дзяцей...

Беды Вялікай Айчыннай сям'я перажывала, як і ўсе лунінчане. Дом, дзе яны здымалі пакой, згарэў у час бамбёжкі, пакінуўшы кватарантаў у тым, у чым схаваліся ў склепе... У 1944 годзе бацьку прызвалі ў Чырвоную Армію. Доўгі час і пасля вайны ад яго не было звестак, але жонка і трое дзяцей, знайшоўшы часовы прытулак у бабулі, чакалі роднага чалавека. Іх спадзяванні ўмацавала вяртанне з фронту брата мамы дзядзькі Фёдара. У 1939 годзе польскі «жолнеж» трапіў у нямецкі палон, але здолеў збегчы ад баўэра, ваяўваў у Чырвонай Арміі. Не маючы ў Лунінцы ні дома, ні працы, завербаваўся ў Калінінград, працаваў на чыгунцы.

Маме, дастаткова пісьменнай на той час, удалося ўладкавацца дастаўшчыцай на станцыю. Дзеці пайшлі ў школу.

– Толькі пасля смерці Сталіна, у сярэдзіне 50-х гадоў да нас дайшлі весткі аб усіх родных людзях – і шчаслівыя, і сумныя, – спакойна, як пра даўно адбалелае, гаворыць Іраіда Аляксандраўна. – Бацька прайшоў баявы шлях без раненняў. Але пасля вайны застаўся ў Польшчы, завёў другую сям'ю. Прыехаў у Лунінец і ўсё здзіўляўся: як жывяце ў такой нястачы?.. Бабуля адмовіла нам у жытле, маўляў, яе нявестка і ўнукі там, дзе сын. Маме далі кватэру ад работы...

Суцяшэнне душы прынеслі лісты ад іншых родных. Як высветлілася, у 1941 годзе мужчынаў прызыўнога ўзросту, вывезеных на лесапавал у Архангельск, паставілі «пад ружжо». Праз год старых, жанчынаў і дзяцей на тых жа таварных саставах у суправаджэнні вартаўнікоў перавезлі праз Сярэднюю Азію ў Іран. Толькі тут, набыўшы статус інтэрнаваных, нашыя землякі даведаліся, што ідзе вайна. Каля года давялося працаваць на розных чорных работах у Тэгеране. У 1943-м палоннікаў пагрузілі на параход і перавезлі ў Афрыку. У Танзаніі (так цяпер называецца былая Таньганіка) працавалі на плантацыях разам з неграмі і радаваліся цеплыні, якая дазваляла жыць у пальмавых шалашах.

– Праз Чырвоны Крыж цёця Ірына увесь час вышуквала мужа, а ён – яе, – паказвае фотаздымкі і копіі дакументаў лунінецкая пляменніца. – Пасля вайны апынуўся ў

Англіі. У 1948 годзе да мужа прыехала жонка са сваім бацькам. Туды ж паведамілі, што на фронце загінуў малодшы з сям'і – Павел Пятровіч Каменка. Дзядуля, які ў свой час вітаў маё паяўленне, дачакаўся нараджэння ўнука, але не паспеў даведацца яшчэ пра двух, якія жылі ў Лунінцы, – памёр у 1954-м...

Госця з Англіі наведала родныя мясціны праз 20 гадоў. Напалоханая заходняй прапагандай, баялася гучна гаварыць і шмат чым цікавіцца. Заплакала на папялішчы ў Любажэрдзі і не спыняла слёз да канца нядоўгага візіту...

– Тады працавала ў дыстанцыі сігналізацыі і сувязі, – завяршае расповед Іраіда Аляксандраўна. – Па маладосці забылася пра акалічнасці знаходжання цёці. Летась прыехаў яе сын Станіслаў – мой стрыечны брат. Ён нарадзіўся ў Англіі, здавалася б, што яму Беларусь? Папрасіла жыхароў Яжавок паказаць нам хутар дзядулі. Як там плакаў мой госць! Узяў шышку, жменю зямлі – сказаў, што гэта будуць самыя дарагія падарункі з радзімы яго бацькоў. Відаць, настальгія перадаецца на генным узроўні...

Іраіда Канапліцкая

З мужам, палякам па нацыянальнасці, ветэран чыгункі развялася яшчэ ў маладосці, захаваўшы толькі яго прозвішча. Сама выгадавала дзвюх дачок. Летась адзначыла 70-годдзе. Не спадзявалася на прыезд родных – далёка жывуць, здароўе падводзіць. Да ўсіх святаў дасылае віншавальныя паштоўкі ў Луганск (ва Украіне сястра з мужам-расіянінам) і ў Камсамольск-на-Амуры (у Расіі брат з жонкай-бураткай). У вольны час любіць чытаць – да кніг і класічнай музыкі прывучыла мама. Жыве спадзяваннямі на вясну, калі зможа аддацца любімаму захапленню, якое таксама перадалося ад самага дарагога чалавека. Столькі кветак, як Іраіда Аляксандраўна, не вырошчвае ніхто з дачнікаў, чые ўчасткі размешчаныя па Навадворскай дарозе...

Таццяна КАНАПАЦКАЯ
Фота аўтара і з сямейнага архіва гераіні

Наведайце Бабруйск

Кожны любіць і ганарыцца месцам, адкуль паходзяць продкі. Мой родны горад – Бабруйск. Я пачала цікавіцца ягонай гісторыяй – шукаць у кнігах, старых газетах... І дзіву даешся, колькі тут было за стагоддзі самых розных падзеяў! З часткаю сваіх росшукаў хачу пазнаёміць чытачоў газеты.

Бабруйск – адзін з найстарэйшых гарадоў Беларусі. У часы Кіеўскай Русі на тым месцы, дзе зліваюцца рэкі Бярэзіна і Бабруйка, было селішча, жыхары якога займаліся паляваннем на баброў, рыбалоўствам і бортніцтвам. Значна пазней на правым высокім беразе Бярэзіны размясцілася ўмацаванае паселішча, першая згадка аб якім адносіцца да 1387 года. Называўся ён па-рознаму: Баброўск, Бабрусак, Бабруеск.

Ад даўняга Бабруйска захавалася крэпасць, пабудаваная ў 1810 годзе пад кіраўніцтвам інжынера капітана К.І. Апермана. У ліпені 1812 года ў крэпасці даў трохдзённы адпачынак свайму войску Баграціён, які пакінуў там хворых і параненых. Пасля крэпасць, якая мела сем тысячаў чалавек гарнізона пры 330 гарматах, была блакаваная французскімі войскамі – спачатку атрадам Лапур-Мабура, затым дывізіяй Дамброўскага. Блакада доўжылася да лістапада. У крэпасці служылі будучыя дзекабрысты М.П. Бястужаў-Румін, З.І. Мураўёў-Апостал, У.З. Нораў і іншыя. У 1818 годзе было прынята рашэнне далей умацоўваць яе, працягвалася яно да сярэдзіны XIX стагоддзя. Аднак крэпасць хутка страціла сваё ваеннае значэнне.

З 28 чэрвеня 1941 года па чэрвень 1944-га Бабруйск быў заняты нямецкімі войскамі. Горад быў вызвалены войскамі 1-га Беларускага фронту пры падтрымцы Дняпроўскай ваеннай флатыліі пад час Бабруйскай наступальнай аперацыі.

Сёння мой родны горад – буйны прамысловы, культурны і спартыўны цэнтр, другі па колькасці насельніцтва ў вобласці і шосты – у дзяржаве. Штогод тут ладзіцца больш за пяцьсот культурных мера-прыемстваў. З найбольш вядомых можна адзначыць фестывалі народнага мастацтва «Вянок дружбы» і харэаграфіі «Ля вытокаў танца», а таксама міжнародны пленэр па кераміцы «Art-Жыжаль». А наш тэатр драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (заснаваны ў 1970 годзе) мае статус Магілёўскага абласнога тэатра. Залетась з нагоды двухсотгоддзя з дня нараджэння пісь-менніка ў Бабруйску праходзіў Міжнародны фестываль нацыянальнай драматургіі, у якім прынялі ўдзел дванаццаць тэатраў з Беларусі, Расіі, Украіны, Малдовы і Латвіі. Вялікая ўвага ў нас надаецца і спорту – масаваму ды прафесійнаму, ёсць свае футбольны і хакейны клубы. У Бабруйску праводзяцца нават міжнародныя турніры.

У горадзе працуе Бабруйскі краязнаўчы музей, экспазіцыя якога распавядае аб археалогіі краю, аб яго гісторыі ад часоў старажытных да нашых дзён.

І яшчэ некалькі цікавых фактаў.

Шырока вядомы Бабруйск і як горад яўрэйскай культуры. Ён ўзгаданы ў кнізе Ільфа і Пятрова «Залатое цяля» як высокакультурны горад, куды імкнуліся ўсе «дзеці» лейтэнанта Шмідта.

У 1949 годзе ЦК КП(б)Б накіраваў прашэнне сакратару ЦК ВКП(б) Малянкову ў гонар 70-годдзя І. Сталіна дазволіць перайменаваць Бабруйск у Сталінск, а Бабруйскую вобласць – у Сталінскую. На шчасце, горад захаваў сваю гістарычную назву.

У 1988 годзе тут створаная рок-група «Би-2».

У 2006 годзе ў горадзе адкрыты помнік бабру.

Колькасць насельніцтва горада цяпер блізу 220 000 жыхароў.

Кацярына ХУРСАНАВА,
вучаніца СШ № 25 г. Мінска
Фота аўтара

Майстры Мяцельскія

Керамічная вытворчасць у Беларусі вядомая з сівой даўніны. Пачатак жа быў пакладзены ў неаліце, 5–6 тысячагоддзяў таму, калі нашыя продкі пачалі вылепліваць гліняны посуд для гатавання ежы на агні. У X стагоддзі з з'яўленнем ганчарнага круга вырабы з гліны набылі больш дасканалы выгляд. Свайго росквіту вытворчасць з гліны ў Беларусі дасягае ў XVI–XVII стагоддзях. Беларускія майстры-керамісты данеслі сваё мастацтва да Масковіі: кафля і керамічныя скульптуры ўпрыгожваюць саборы Крамля, шматлікія маскоўскія храмы, палацы. Гістарычныя крыніцы захавалі прозвішчы тагачасных выдатных майстроў: гэта мсціслаўскі Сцяпан Іваноў (Палубес), Ігнат Максімаў з Копысі, І. Ялфімаў з Магілёва... Нашыя майстры вучылі маскавітаў керамічнаму мастацтву, стварылі там школу керамікі. У Беларусі ж з'явіліся буйныя цэнтры вытворчасці гліняных вырабаў – Івянец, Пружаны, Ружаны, Гарадная, Крэва, Ракаў, Заслаў'е і інш.

Нядаўна мне пашчасціла сустрэцца з прадстаўнікамі гэтай старажытнай прафесіі – жыхарамі Дзяржынска Андрэем Мяцельскім і яго жонкай Кацярынай, ураджэнкай Баранавічаў, нядаўняй выпускніцай Баранавіцкага дзяржаўнага універсітэта. У звычайнай дзяржынскай двухпакаёвай кватэры Мяцельскія за кубачкам кавы распавялі пра свой жыццёвы шлях, пра сваю творчасць, падзяліліся планамі на будучыню... У Кацярыны не было ў родзе ганчароў, яна першая. Каця з дзяцінства добра малявала, валодала музычнымі здольнасцямі, і таму бацькі Каці – Уладзімір Леанідавіч і Ніна Канстанцінаўна Рамашкі параілі ёй паступіць вучыцца ў музычную школу, якую яна і скончыла. А яе малюнкі і сёння ўпрыгожваюць пакоі бацькоўскага дома. А пачала яна «сябраваць» з глінай у час навучання на факультэце дашкольнай адукацыі, дзе быў гурток керамікі, якім кіраваў вядомы на Баранавіччыне мастак Леанід Капуза, дзякуючы якому Каця і захапілася гэтай справай.

Неяк у Баранавічах праводзілася Свята горада, на якім дзейнічала выстаўка твораў народных умельцаў. Кацярына, у той час студэнтка, выстаўляла свае творы, а Андрэй Мяцельскі ужо вопытны майстар-кераміст, – свае. Яны пазнаёміліся, а потым і пабраліся шлюбам. Кацярына, меней вопытная, вучыцца цяпер ужо майстэрству ў свайго мужа і за кароткі час паспела атрымаць за ўдзел у выстаўках граматы і дыпломы.

У Андрэя таксама не было ў родзе ганчароў. Яго прадзед, Гілярый Доўнар, як і дзед Антон, былі на Койданаўшчыне працавітымі земляробамі, а маці і бацька працавалі на прадпрыемствах Дзяржынска. Яшчэ ў раннім дзяцінстве ў Андрэя выявіўся талент да малявання, таму ён паралельна з навучаннем у агульнаадукацыйнай школе займаўся ў Дзяржынскай мастацкай школе ў мастака Уладзіміра Шчарбіна. А любоў да лепкі, керамікі Андрэю прывіла вопытны педагог Наталля Ермаловіч. У час вучобы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў авалодаў тэхнікай вырабу керамікі, габеленаў, саломапляцення. Пасля заканчэння вучобы Андрэй працаваў і майстрам па ганчарстве, і выкладчыкам па кераміцы ў навучальных установах Мінска, а потым скончыў Беларускі інстытут правазнаўства і атрымаў дыплом юрыста-міжнародніка. У вольныя хвіліны, якіх у яго, на жаль, не шмат, ён піша пабеларуску цікавыя гумарэскі, байкі ў прозе, філасофскія развагі аб жыцці і творчасці.

Андрэй Мяцельскі

Кацярына Мяцельская

Андрэй Мяцельскі – адзін з нямногіх керамістаў, які выкарыстоўвае такія цяжка сумяшчальныя матэрыялы, як гліна і саломка: як ён азначае, творчасць не ведае межаў. Яго мастацкі керамічны твор «Дрэва жыцця» сімвалізуе сувязь пакаленняў. Зачароўваюць таксама і прыгожыя музычныя інструменты – акарыны, і разнастайныя біклагі, вазы, глякі... Андрэй шырока карыстаецца вядомымі яшчэ з ранняга жалезнага веку відамі апрацоўкі гліняных вырабаў – як дымленнем і васкаваннем, якія надаюць керамікі прыгожы выгляд. Таленавіты дзяржынскі мастак-кераміст – удзельнік шматлікіх міжнародных і айчынных выставак, ён сябра Праўлення Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Кераміка Андрэя дэманстравалася ў Францыі, Малдове, Літве, Расіі.

Летась у кастрычніку Мяцельскія былі ўдзельнікамі Дзён Мінскай вобласці ў адной з акруг Масквы, дзе была наладжаная выстаўка-кірмаш майстроў народнай творчасці. Андрэй Мяцельскі за ганчарным кругам, у белай, аздобленай беларускім нацыянальным арнаментам, кашулі дэманстраваў масквічам сваё майстэрства, а Кацярына размясцілася побач за прылаўкам з гатовымі ганчарнымі вырабамі. Масквічы з цікавасцю знаёміліся з іх вырабамі і хвалілі за тое, што беларусы зберaглі, не згубілі свае традыцыйныя рамёствы. Дарэчы, кашулю пашыў і ўпрыгожыў арнаментам Андрэй сам. З усіх выставак Мяцельскія вяртаюцца з Дыпломамі і Ганаровымі граматамі, якіх ужо больш за трыццаць. Дарэчы, 7 снежня з далёкага горада Навасібірска Ан-дрэй таксама прывёз Ганаровыя Дыпломы, якімі былі ўзнагароджаныя ён і яго жонка Кацярына.

Сёння Кацярына Мяцельская займае пасаду дырэктара Дзяржынскага раённага Дома рамёстваў, а Андрэй працуе там жа майстрам-метадыстам па кераміцы. Абое яны марыць аб тым дні, калі ў Доме рамёстаў запрацуюць цэхі майстроў-керамістаў, кавалёў, ткачоў, калі адкрыюцца шапікі па продажы сувенірных вырабаў для шматлікіх замежных і айчынных турыстаў.

Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск

Чаго вочы баяцца, тое рукі зробяць

У гомельскай гарадской бібліятэцы № 11 адбылася сустрэча з майстрыхай Аленай Кальцовай, якая жыве ў Рагачове (пра яе «КГ» пісала ў № 43–44 за 2009 г.). А ў Гомель яна прыехала, каб пазнаёміць гараджанаў з творчымі набыткамі – непаўторнымі рэчамі, якія стварае сваімі рукамі. Такія сустрэчы даюць магчымасць зрабіць выснову: кожны чалавек – асоба, які ў стане развіваць у сабе адметныя здольнасці.

Госця расказала пра свае захапленні, прадэманстравала вырабы з бісера, венецыянскія маскі, графічныя малюнкі. Захапленне ў настаўнікаў і вучняў СШ № 47, вядома ж, выклікалі прыгожыя экзатычныя маскі. Давялося няспынна адказваць на ўсе пытанні ды знаёміць школьнікаў з працэсам іх вырабу.

Як падкрэсліла А. Кальцова, кожны чалавек ад прыроды таленавіты і працавіты. Галоўнае, не трэба ніколі ленавацца, а імкнуцца развіваць свае здольнасці, шукаць занятак для душы, каб так званыя шэрыя будні ператварыліся ў сонечныя.

Галіна МІКАЛАЕВА

На фота Алены Палхоўскай Алена Кальцова

«Жавароначкі» – галасістыя...

Што ні кажыце, а калі народныя абрадавыя песні спяваюць дзеці, значыць будзе жыць роднае слова.

Мастацкі кіраўнік Наталля Паўлаўна Баяльская з 1984 года свае веды і любоў да мастацтва перадае дзецям. Ансамбль «Жавароначкі» – яе крывіначка, яе жыццё – гэта ўзорны ансамбль Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка. У сваім рэпертуары гурт звяртаецца да традыцыяў беларускага народа, да бабулінай песні. Дзеці беражліва ставяцца да спадчыны продкаў і з сцэнічнай пляцоўкі перадаюць сваю любоў гледачу.

Хвалююць канцэрты ансамбля ў дзіцячых дамах і дамах састарэлых. Маленькія артысты шмат ездзяць па родным краі і за межамі Беларусі, ладзяць запамінальныя сустрэчы з гледачамі розных нацыянальнасцяў. І асаблівы гонар – за найбагацейшую культурную спадчыну свайго народа.

«Купальскія ігрышчы», «Вясновыя гуканні», «Ураджайнае жніво», «Жарты калядныя» ды іншыя абрады разумеюць усе – і доўга не сціхаюць апладысменты.

Дзякуючы кіраўніцтву універсітэта ў ансамбля дыхтоўныя строі, музычныя інструменты, аркестровая група, якой кіруе аднадумца Наталлі Паўлаўны Аляксандр Салаўёў. Пад музыку ногі самі ідуць у скокі: «Жавароначкі» падхопліваюцца ў танцы, плывуць у карагодах – заслуга ў гэтым харэографа Жанны Ядлоўскай, якая заўжды шчыруе над новымі танцавальнымі кампазіцыямі.

Цяпер ансамбль «Жавароначкі» рыхтуе новую праграму, прысвечаную Вялікай Перамозе.

Лёгкага вам палёту, «Жавароначкі»!

Мікола КОТАЎ

У цэнтры Наталля Баяльская

У час выступу

Варанякі

Жывёлы і птушкі – такія ж, як мы. Толькі гавораць на іншай мове. І таксама, як людзі, яны хочуць, каб іх разумелі і шкадавалі.

Каля майго дома ў Мінску, у лесапаркавай зоне, у той частцы, дзе растуць высокія вольхі, селяцца вароны. Іх гнёзды на самых вершалінах. Людзі стараюцца абыходзіць гэтую «Варанячую Слабодку», не любяць яе, а вароны ў сваю чаргу падымаюць гвалт і пачынаюць «бамбардзіраваць» памётам неасцярожнага разяваку, які апынуўся паблізу.

Кожнае раніцы, зімою і летам, птушкі з крыкам збіваюцца ў чароды і ляцяць у горад «на заробкі» – здабываць корм. Вечарам вяртаюцца не ўсе – вялікі горад поўны небяспекі. І марна будуць чакаць бацькоў галодныя птушаняты...

Адна варонка пакалечылася і прыйшла да нашага пад'езда. Як узрадаваліся бабулі, што сядзяць на лаўцы! Паставілі ёй талерачку, налілі малака, паклалі хлеб. Варона адшчыквае хлеб, кладзе ў талерачку, чакае, пакуль ён набрыняе малаком, есць. Усё гэта няспешна, з годнасцю – як чалавек. Адна бабулька глядзіць на яе і выцірае слёзы: «Я такая ж адзінокая і гаротная, як гэтая варанячка!..»

«Варонамі» дражняць людзей няўважлівых, тугадумных. Усе мы добра ведаем байку пра варону, лісіцу і сыр. А вось сябар расказваў мне такую гісторыю. Кот грыз костку. Варона хадзіла побач і аблізвалася. Не могучы цярпець, зайшла ззаду і ўшчыкнула яго за хвост. Кот хвост падцяў, і грызе далей костку. Тады варона дзюбае яму ў спіну, кот рэзка паварочваецца, птушка ўзнімаецца ўгору, пералятае праз яго... Імкліва пікіруе – і з косткай у лапах нашай вароны як і не было!

А кот зрабіў выгляд, што нічога не здарылася.

Андрэй ФЕДАРЭНКА

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

КАРАВАЙ – *(заканчэнне артыкула. Пачатак у № 4)*. Дастаўшы каравай з печы і тройчы з ім пакружыўшыся, клалі яго на века дзяжы, пакрытае белым абрусам і пасыпанае аўсом, жытам і хмелем.

Калі каравай астываў, пачыналася яго аздабленне. Пераважалі два віды ўпрыгожвання: фігуркамі, спечанымі з цеста, і галінкамі. На каравай маладой пасярэдзіне ставілі спечаную з цеста вялікую шышку або гуску, а вакол – маленькія шышачкі, гусачкі, зорачкі, кветачкі, абараначкі, васьмёркі, фігурку спавітага дзіцяці ды інш., а пасярэдзіне каравая маладога – найчасцей паўмесяц, часам – шышку або гусачка, вакол – бочачкі з абручыкамі, пеўня, курыцу і інш. Зверху ўпрыгожвалі зелянінай (лісцікамі, пучочкамі руты, мірты, мяты, каліны), ягадамі брусніцаў, вішні, каліны, арабіны, кветкамі з каляровай паперы. Аздабленне галінкамі адпавядала больш разгорнутаму абраду каравая. У ім фігуркі з цеста – не асноўнае аздабленне, іх і не відаць з-за галінак елкі, сасны, грушы, яблыні і ўпрыгожаных зверху фарбаванымі пучкамі каласоў аўса, арабіны, каліны, зялёнай амялы з белымі ягадкамі. На Палессі гэтыя ўпрыгожаныя рагацінкі называлі шышкамі. Каб шышкі з рагацінак не нахіляліся ў бакі, іх абвязвалі чырвоным ваўняным поясам з нанізанымі на яго абаранкамі, а зверху накрывалі каляровай або белай хусткай, сам каравай абвязвалі вышытым ручніком. Зверху да шышак часта прывязвалі адну або тры свечкі, якія запальвалі ў абрадавыя моманты вяселля. Прадметам аздаблення надавалася сімвалічнае і магічнае значэнне.

Аздоблены каравай бацька маладой (маладога) пачастункам выкупляў у каравайніцаў і ставіў яго ў засекі клеці на жыта. Едучы па маладую, малады забіраў свой каравай з клеці і вёз яго з сабою. На ім гарэлі свечкі і вісеў вяночак для маладой. Па прыездзе вясельнікаў сват маладога ўваходзіў у сенцы, высока падняўшы над галавой каравай маладога, і прасіў вынесці каравай маладой. Такім жа чынам яго сустракаў сват маладой, імкнучыся падняць свой каравай вышэй, што азначала перавагу аднаго з членаў будучай сям'і і адпаведна аднаго з родаў. Караваі маладых ставілі побач на века дзяжы, і сваты, падняўшы яго, утваралі своеасаблівую браму, пад якой праходзілі блізкія сваякі маладых ў хату. Гэты рытуал азначаў злучэнне маладых і парадненне іх родаў. У адных выпадках маладыя абменьваліся караваямі, у другіх – толькі шышкамі з іх, а ў некаторых – зусім не абменьваліся. Падзел каравая адбываўся згодна з выпрацаваным стагоддзямі рытуалам. Дзелячы яго, старэйшы сват (старэйшына) сярэдзіну аддаваў маладым, «падэшву» (ніз каравая) – музыкам, астатнюю частку дзяліў паміж роднымі ў залежнасці ад ступені сваяцтва: першымі кавалак атрымлівалі бацькі, затым хросныя бацькі, цёткі, дзядзькі і г.д. Рэшткі, акрамя аднаго кавалачка, які з векам выносілі ў клець, раздавалі стороннім; яны імкнуліся атрымаць хоць невялікі кавалачак, каб пакласці яго ў насеннае збожжа, што павінна было стымуляваць багаты ўраджай, даць скаціне і хоць крышку з'есці самім. Ужыванне каравая звязвалася з павер'ем, што гэты акт садзейнічае ўрадлівасці палёў, пладавітасці скаціны, забяспечвае дастатак і шчасце. За атрыманую частку каравая кожны з прысутных чым-небудзь адорваў маладых. Звычайна падзелам каравая вяселле заканчвалася (у некаторых мясцовасцях яго дзялілі перад вясельным застоллем). Асноўныя элементы абраду захаваліся па ўсёй Беларусі да нашага часу;

2) хлебны выраб, вялікі круглы бохан, спечаны да якой-небудзь урачыстасці (зажынкі, дажынкі, фэсты ды інш.).

КАРАВАЙНІЦЫ – удзельніцы абраду прыгатавання каравая ў хаце маладой і ў хаце маладога. Выбіраліся паважаныя замужнія жанчыны, якія былі ў першым шлюбе і жылі ў сямейнай згодзе (не бяздзетныя). Звычайна колькасць няцотная, а ў некаторых мясцовасцях – толькі цотная. Старшая каравайніца (пачынальніца; найчасцей ёю была хросная маці або родная цётка) першая пачынала кожны этап (сыпала муку, рашчыняла і мясіла цеста), кіравала ўсім працэсам прыгатавання каравая і звярталася да ўсіх прысутных са спецыяльнымі формуламі-просьбамі дабраславіць каравай рашчыніць, замясіць, упрыгожыць, вынесці ў камору і г.д. Атрыбутам старэйшай каравайніцы часам была прымацаваная да яе хусткі пасмачка кужалю або некалькі ваўняных нітак чырвонага колеру.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Камунальная набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 04.02.2010. Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 123. Тыраж 1200 асобнікаў.